2 Устав и платформа Всероссийского союза равноправия женщин [Электронный ресурс] – Режим доступа : http// www.tvergenderstudies.ru.

3 Положение о выборах в Учредительное собрание от 20 июня 1917 г. [Электронный ресурс] – Режим доступа: http//www/historysibsuti.narod.ru.

## БАСНІЙСКІ КРЫЗІС КАНЦА XX СТАГОДДЗЯ

***Ю. В. Філоненка*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***С. А. Чаропка***
*канд. гіст. навук, ст. выкладчык*

Рэгіянальныя канфлікты ў свеце не спыняюцца на працягу ўсей гісторыі чалавецтва. Да іх нярэдка прыводзіць сацыяльная, нацыянальная і канфесійная неаднастайнасць грамадства. У пачатку 90-х гг. XX ст. пачынаецца Баснійскі крызіс, які стаў паказчыкам складанага становішча на Балканах. Грамадзянская вайна ў Босніі і Герцагавіне (БіГ) прывяла да разрухі, тысяч бежанцаў, варожасці паміж народамі, якія яе насялялі. Бязлітаснасць і працягласць гэтага канфлікту не змаглі прадбачыць большасць навукоўцаў і палітыкаў, чым можна вызначыць актуальнасць дадзенай тэмы даследвання.

Перадумовы канфлікту ў БіГ вызначаліся яе складаным гістарычным развіццём, у выніку якога на невялікай тэрыторыіі ўзнікла шматрэлігійная і шматэтнічная дзяржава. Ужо ў сярэднія вякі на тэрыторыі баснійскіх земляў сутыкнуліся тры цывілізацыі: праваслаўная, каталіцкая і ісламская. Інтарэсы жыхароў Босніі ў дачыненні будучыні краіны пасля распаду Югаславіі былі рознымі: лідэры баснійскіх мусульман узялі курс на аддзяленне ад СФРЮ, баснійскіх харватаў цікавіла ўмацаванне сувязяў з Харватыяй, сербы бачылі будучыню БіГ у складзе абноўленай дэмакратычнай Югаславіі. Бакі не жадалі лічыцца з інтарэсамі адзін аднаго, што з цягам часу ўсё больш ускладняла становішча ў БіГ. Акрамя таго, рэлігійныя і этнічныя супярэчнасці паміж трыма асноўнымі народамі БіГ актыўна выкарыстоўвалі для дасягнення сваіх мэт заходнія еўрапейскія краіны, ЗША і ісламскі свет, яны шмат у чым садзейнічалі іх развіццю і абвастрэнню. Такім чынам, прычыны Баснійскага крызісу 90-х гг. XX ст. маюць як унутраны, так і знешні характар [1].

Канфлікт ў БіГ працягваўся да 1995 г. і завяршыўся падпісаннем Дэйтанскай дамовы, згодна з якой тэрыторыя краіны была падзелена на дзве састаўныя часткі: Федэрацыю БіГ і Рэспубліку Сербскую, кожная з якіх атрымлівала 51 % і 49 % тэрыторый адпаведна. Аднак Дэйтанскія дамовы хоць і спынілі ваенныя дзеянні на тэрыторыі БіГ, але не змаглі канчаткова вырашыць тэрытарыяльныя прэтэнзіі бакоў канфлікту, напружнасць у адносінах трох асноўных катэгорый насельніцтва краіны не знікла і да гэтага часу.

**Літаратура**

1 Гуськова, Е. Ю. История югославского кризиса (1990–2000), / Е. Ю. Гуськова – М. : Русское право, 2001. – 720 с.

## ПОЛИТИКА ТРЕТЬЕГО РЕЙХА В ОТНОШЕНИИ НЕМЕЦКИХ ПИСАТЕЛЕЙ В ЭМИГРАЦИИ В 1930-е ГОДЫ

***Т. А. Шеин*** *(УО «ГГУ им. Ф. Скорины»)*
*Научн. рук.* ***А. М. Бабков,***
*канд. ист. наук, доцент*

С приходом к власти 30 января 1933 г. национал-социалисты приступили к построению тоталитарного государства. Стремясь к тотальному контролю над всеми слоями